МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

25 студзеня 2019 г. № 4 (489)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

ДАПАМАГЧЫ НЕЛЬГА ПАКІНУЦЬ,

або Размова аб праблемах і прапановах нашых грамадзян

Прыём вядзе кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля КАЧАНАВА (горад Навагрудак Гродзенскай вобласці).

Фота БелТА.

ШТО турбуе людзей? Тысячы лістоў з адказам на гэтае, здавалася б, простае пытанне штомесяц прыходзяць у Адміністрацыю Прэзідэнта нашай краіны, дзе з кожным зваротам старанна працуюць спецыялісты. Дык усё-ткі, аб чым просяць і што прапаноўваюць нашы грамадзяне? Чаму спрабуюць вырашыць свае пытанні праз вышэйшую інстанцыю, а не на мясцовым узроўні? Якія звароты Прэзідэнт чытае асабіста? Пра гэта і многае іншае мы пагаварылі з начальнікам галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Рыгорам ШЛЫКАМ.

стар. 4

МАНІТОРЫНГ З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

Заканадаўцы вывучаюць сітуацыю ў Чачэрскім раёне Гомельскай вобласці

Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні правяла выязное пасяджэнне. Сенатары прааналізавалі сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёна, правялі асабістыя прыёмы грамадзян, а таксама пазнаёміліся са славутасцямі гэтага краю. Раён стаў першым у шэрагу адрасоў падобнага маніторынгу і пошуку пунктаў эканамічнага росту.

Чачэршчына была абрана па прапанове аднаго з членаў пастаяннай камісіі — **дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Звязда» Галіны ТРЫБУНАХ.** «Звязда» — адно з самых моцных прадпрыемстваў Чачэрскага раёна. Арганізацыя займаецца вырошчваннем збожжавых, зернебабовых, кармавых і тэхнічных культур, а таксама вытворчасцю малака і мяса. У раёне няма буйной прамысловасці, тым не менш за студзень — лістапад 2018 года арганізацыямі атрымана прыбытку больш чым на 64 мільёны рублёў. Тэмп росту склаў прыкладна 110 працэнтаў да такога ж перыяду ў 2017-м.

стар. 3

Парламентарыі наведалі Чачэрскую дзіцяча-юнацкую спартыўную школу.

Фота БелТА.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Ёсць такія мэты!

Устойлівае развіццё залежыць ад усіх нас. стар. 2

Орша: перазагрузка

Прывабныя ўмовы для бізнесу ў рэгіёне. стар. 2

Хутка і зручна

Самы папулярны спосаб размовы з уладай. стар. 13–14

Што хвалюе навасёлаў?



Інфраструктура павінна развівацца разам з будаўніцтвам жылля. стар. 15

Патэнцыйная пагроза



Ці існуе яна для сталых жыхароў вёсак? стар. 16